# ПРАЕКТ МАБІЛЬНАГА ДАДАТКУ ДЛЯ ПЕРАКЛАДУ

*Емельяненка А.А.*

*Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі и радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Наўроцкая І.В. – старшы выкладчык*

У артыкуле апісваецца распрацоўка мабільнага дадатку «Скарбонка слоў» для пошуку перакладаў слоў з рускай на беларускую мову і наадварот. Разглядаюцца асаблівасці карыстання мабільным дадаткам.

Распрацаваны мабільны дадатак “Скарбонка слоў” па функцыяналу нагадвае анлайн-слоўнік і мае магчымасць перакладаць словы з беларускай мовы на рускую або з рускай на беларускую. У праекце дадатку прадстаўлены дзве мовы інтэрфэйсу (беларуская і руская). На малюнку 1 прадстаўлена дэманстрацыйная версія дадатку.




Малюнак 1 – Дэманстрацыя працы з дадаткам

Праект слоўніка распрацаваны такім чынам, каб у карыстальніка была магчымасць дадаваць свае пераклады слоў, а таксама дадаткова загружаць неабходныя карыстальніку слоўнікі у фарматах pdf, txt. У праект дадатку намі дададзены для выкарыстання перакладныя лексікаграфічныя крыніцы [1; 2]. Адзначым, што пры даданні слоўнікаў ў фармаце pdf карыстальнік мае магчымасць указаць, з якой і па якую старонку трэба выкарыстоўваць дадаваны слоўнік. Таксама пры даданні слоўніка ў мабільны дадатак трэба ўказваць рэгулярны выраз з дзвюх груп: першая — слова, якое трэба перакласці, а другая — яго пераклад.

Распрацаваны намі дадатак “Скарбонка слоў” працуе без падключэння да сеціва. У параўнанні з іншымі дадаткамі, напрыклад, такімі як "Skarnik" [4], у гэтага праекта больш магчымасцей для змянення свайго вопыту працы са слоўнікам. Так, карыстальнік можа дадаваць слоўнікі, якіх няма у пачатковай версіі дадатку, або ствараць сваю неабходную базу.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Беларуска-рускі слоўнік. У 3 т.: Каля 110000 слоў / рэд. К.К. Атраховіч 3-е выд., перапрац. і дап. М. Беларуская Энцыклапедыя, 2003
2. Руска-беларускі слоўнік. У 3 т.: Каля 110000 слоў / рэд. К.К. Атраховіч 8-е выд. М. Беларуская Энцыклапедыя, 2002
3. Github [Электронны рэсурс]: WordStorage. — Рэжым доступу: https://github.com/SlonopartI/WordStorage -Дата доступу 15.04.2025
4. Скарнік [Электронны рэсурс]: -Рэжым доступу: https://www.skarnik.by — Дата доступу:15.04.2025